**Агнежка Бругер**

Дэпутатка Бундэстагу Нямеччыны
Намесніца старшыні фракцыі партыі
„Саюз 90/ Зялёныя“ у Бундэстагу

Agnieszka Brugger MdB • Platz der Republik 1 • 11011 Berlin

Марфа Александровна Рабкова
СИЗО-1
ул. Володарского, 2
220030, г. Минск
REPUBLIC OF BELARUS

Platz der Republik 1
11011 Berlin
Telefon: 030 227 71570
Fax: 030 227 76195
E-Mail: agnieszka.brugger@bundestag.de

г. Берлін, 12 верасня 2022

Дарагая Марфа Рабкова!

Пішу Вам сёння з вялікім захапленнем Вашай неверагоднай мужнасцю, рашучасцю і сілай, каб выказаць Вам не толькі сваю вялікую салідарнасць, але і салідарнасць многіх людзей у Нямеччыне.

Я шмат пра Вас думаю і рэгулярна атрымліваю інфармацыю пра Вашу сітуацыю ад «Вясны» і швейцарска-нямецкай праваабарончай арганізацыі Libereco. З вялікім клопатам я сачыла за суровым прысудам, вынесеным у дачыненні да Вас, а таксама за трывожным станам Вашага здароўя і Вашай разлукай з сям'ёй. Мне таксама хацелася б выказаць свае глыбокія спачуванні і спагаду ў сувязі са стратай Вашага бацькі і Вашай бабулі. Мяне вельмі засмучае, што Вам нават не далі магчымасці развітацца з імі. Для ўсяго, што адбываецца цяпер пасля працэсу, я зычу Вам шмат сіл і захавання Вашай цудоўнай рашучасці і аптымізму.

Праз два гады пасля Вашага зняволення, 17 верасня 2020 года, мне хацелася б запэўніць Вас, што мы не забудземся на Вас, на Вашых калег з «Вясны» і многіх іншых мужных людзей, якія знаходзяцца ў зняволенні ў невыносных умовах з-за сваёй прыхільнасці да свабоды і дэмакратыі.

Я цвёрда пераканана, што разам з вялікай колькасцю людзей, якія падзяляюць такія нашы каштоўнасці, як свабода і дэмакратыя, мы можам змяніць свет. Дзякуючы Вашай неверагодна вялікай асабістай адданасці гэтым каштоўнасцям у спалучэнні з вялікай колькасцю ахвяр, Вы з'яўляецеся выдатным узорам для пераймання для мяне і многіх іншых людзей.

Жадаю Вам, Вашым родным, сябрам і паплечнікам шмат сіл, стойкасці і моцнага здароўя. Перш за ўсё, я жадаю Вам - і я працую над гэтым, выкарыстоўваючы ўсе мае магчымасці, - каб Вы нарэшце атрымалі справядлівасць і зноў сталі свабоднымі.

З павагай і салідарнасцю,

A. Brugger

Агнешка Бругер